ЭХ ВЫ, КОНІ...

ДАВЕДКА

Конкурс «Тандэм» праводзіць у нашай краіне ўжо другі раз Асацыяцыя агенцтваў мясцовай дэмакратыі пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза. Са слоў ***Марыям ХАТЭНАШВІЛІ, менеджара праекта і кіраўніка Брусельскага офіса ALDA:*** *«Асацыяцыя агенцтваў мясцовай дэмакратыі — няўрадавая арганізацыя, створаная Саветам Еўропы ў 1999 годзе. Наша мэта — прыцягнуць актыўных жыхароў да рашэння праблем мясцовага значэння, спрыяць развіццю іх супрацоўніцтва з мясцовымі органамі ўлады, у тым ліку і з дапамогай выдзялення міні-грантаў на падтрымку мясцовых праектаў».*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Праз два тыдні мы атрымалі адказ райвыканкама, дзе гаворыцца, што нам адмаўляюць у сувязі з тым, што позна да іх звярнуліся. Але ж калі падавалі заяўку на атрыманне гранта, мы не маглі ведаць, што пройдзем конкурсны адбор і атрымаем адабрэнне. На той час у нас быў ліст падтрымкі Астрынскага сельскага Савета. І да таго ж — што тут доўга вылічваць: ці патрэбны падобныя мерапрыемствы вяскоўцам? Гэта ж не палёт на Марс!

Аграсядзіба «Конны двор «Кентаўр» знаходзіцца ў цэнтры вёскі Вялікія Бярозаўцы, за 5 км ад Астрыно. Там мяне сустрэла Людміла Басак са сваімі выхаванцамі:

— Мы хацелі правесці прыгожы фестываль — для сябе, для вяскоўцаў. Я не бачу важкай прычыны для адмовы. Яшчэ можна было б зразумець, калі б мы прасілі грошай...

Калі ехала ў Вялікія Бярозаўцы, думала распытаць у дзяцей, наколькі для іх важны сам гурток, конны фестываль... Але пасля таго, як пабыла на занятку, убачыла, як гарэлі вочы школьнікаў, калі яны надзявалі шлем, калі садзіліся хто на Архідэю, хто на Камелію — усе пытанні адпалі самі сабой.

Школьнікі з радасцю наведваюць гурток верхавой язды, якім кіруе Людміла БАСАК.

— Конны фестываль у Год каня, — выказвае сваё меркаванне **загадчыца Астрынскай дзіцячай бібліятэкі Ганна СЦЯПАНЧАНКА,** якую мы выпадкова сустрэлі, калі вярталіся ў Шчучын, — пагадзіцеся, задума вельмі цікавая. А галоўнае, людзі чакаюць. Сёння ў стаматолага была, дык доктар кажа: «Вы мне хоць патэлефануйце, як будзе гэты фестываль — абавязкова прыеду». А калі не будзе фестывалю, дык скажуць: «Вось дык камерсанты: бяруцца, абяцаюць, а нічога не зрабілі». Гэткая рэакцыя будзе дакладна, вось паглядзіце.

Дарэчы, менавіта ад Ганны Сцяпанчанкі я даведалася, што выхаванцы Людмілы Басак са сваёй экалагічнай сцежкай перамаглі ў абласным конкурсе дзіцячых праектаў.

— Першае месца занялі ў вобласці. Няўжо дрэнна, што дзеці з радасцю ходзяць у гурток замест таго, каб піць, курыць?

— А вы як думаеце, чаму ў райвыканкаме не даюць ліст падтрымкі на правядзенне фестывалю?

— Ведаеце, усё залежыць ад чалавека, з якім сутыкаешся. Хутчэй за ўсё, перастрахоўваюцца, каб чаго не здарылася. Але ў нашым выпадку — там, дзе не патрэбна...

– Алега Мікалаевіча Сямашку мы ўсе тут ведаем добра, паважаем і ставімся ў цэлым да яго дзейнасці па развіцці аграгурызму толькі добра, — патлумачыла **Ганна ХВЯДЗЮК, намеснік старшыні Шчучынскага райвыканкама.** — Але ён да нас звярнуўся па ліст падтрымкі ў канцы сакавіка, хоць тэрмін рэалізацыі праекта — з 15 лютага. Мы ж не можам прымаць удзел, калі з намі загадзя нічога не ўзгаднялі. Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці на нас не выходзіў. Калі звернецца, разгледзім гэтае пытанне.

— Задума сапраўды добрая, — дадаў **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шчучынскага райвыканкама Аляксандр АМШЭЙ.** — Калі б Алег Сямашка раней, на этапе распрацоўкі, звярнуўся да нас, то, у прынцыпе, думаю, не было б праблем. Магчыма, нават адным з партнёраў сталі б у гэтым праекце. Аднак тады ён не звярнуўся да нас непасрэдна, нешта вырашаў з мясцовымі ўладамі на ўзроўні сельсавета. Атрымалася так, што і старшыня сельскага Савета нам не паведаміў. Дарэчы, цяпер, пасля выбараў, ён на гэтай пасадзе ўжо не працуе.

Вырашыла даведацца, што думаюць наконт сітуацыі, якая склалася, у Гродзенскім аблвыканкаме. Бо, не сакрэт, што на Гродзеншчыне вельмі шмат добрых спраў робіцца пры дапамозе грантаў Еўрапейскага саюза.

— Мясцовыя ўлады самі вызначаюць, даваць ліст падтрымкі ці не. Нідзе не запісана, што з намі трэба ўзгадняць. Калі не падтрымліваюць, пэўна, ёсць на гэта нейкія важкія прычыны. Шмат цікавых ініцыятыў на Гродзеншчыне ўкараняецца, у тым ліку і дзякуючы замежным грантам Еўрапейскага саюза. Не памятаю такога, каб быў нейкі цікавы праект, а яго не падтрымалі, — патлумачыў **Павел СКРАБКО, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама.**

❍❍❍

Калі вярстаўся гэты матэрыял, патэлефанаваў Алег Сямашка. Сказаў, што ўсё ж такі падаў дакументы ў Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці — без ліста падтрымкі ад райвыканкама. Цяпер чакае рашэння.

— Алег Мікалаевіч, калі адказ будзе адмоўным, што будзеце рабіць?

— Параіліся і вырашылі, што незалежна ад таго, атрымаем гэтыя грошы ці не, фестываль будзем праводзіць, як і планавалі, 7 верасня. Гэтага чакаюць многія паважаныя, неабыякавыя людзі нашага рэгіёна, аднавяскоўцы, таму падводзіць іх мы не маем права. Прыязджайце — пабачыце, што ў нас атрымаецца.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

ПРОСТАЯ РЫНКАВАЯ ФОРМУЛА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Паводле інфармацыі аблсельгасхарча, сёлета ў рэгіёне ўводзіцца ў эксплуатацыю свінакомплекс ААТ «Жабінкаўскі камбікормавы завод», дзе будуць трымаць 18 тысяч жывёлін. Новы комплекс на 3 тысячы галоў адкрывае прыватнае прадпрыемства «Прыбужжа» ў Брэсцкім раёне. Распрацаваны план мерапрыемстваў па павелічэнні пагалоўя на комплексе «Усходні» Баранавіцкага раёна і іншых падобных комплексах.

Але мерапрыемствы, што называецца, не паспяваюць за сюрпрызамі, якія падносіць жыццё. З-за той жа злашчаснай афрыканскай чумы пастаўкі мяса з Польшчы ў нашу краіну забаронены. А некаторыя брэсцкія вытворцы мясных вырабаў, асабліва ў свабоднай эканамічнай зоне, амаль поўнасцю працавалі на польскай сыравіне. Цяпер яны перайшлі на свініну айчынную. Ну і, вядома, ад экспарту ніхто не адмовіцца. Нават невялікае яго памяншэнне можа азначаць страту знешніх рынкаў, на што нашы мясаперапрацоўшчыкі пайсці не могуць. Усё гэта разам і стварае дэфіцыт тавару, да разнастайнасці якога і, як бачым цяпер, даступнай цаны мы паспелі прывыкнуць у папярэднія гады.

Прыватная гаспадарка

Калі ў грамадскай свінагадоўлі ўзніклі пэўныя праблемы, то зрэагаваць маглі б вясковыя гаспадары, а заадно і нядрэнна зарабіць на продажы лішкаў для папаўнення сямейнага бюджэту. Але і прыватны статак «пятачкоў», як ужо гаварылася, прыкметна парадзеў. Пасля таго, як ў Беларусі былі зафіксаваны выпадкі захворвання на афрыканскую чуму, чатыры раёны вобласці — Баранавіцкі, Ляхавіцкі, Івацэвіцкі, Пружанскі — атрымалі статус буферных. Там поўнасцю было выразана пагалоўе свіней на прыватных падворках. Людзі купілі маразільнікі, паклалі мяса ў запас. Праз некалькі месяцаў гэтыя запасы скончыліся, і паўстала пытанне, як далей карміць сям'ю, што прадаваць дзецям у горад. Тым больш, што ў вясковым асяродку склаліся свае харчовыя прывычкі, нават традыцыі. Паводле трапнай заўвагі кіраўніка дзяржавы: мы, маўляў, не мусульмане і прывыклі, асабліва да свята, на стол паставіць каўбасу, пальцам пханую, дамашні сальцісон і іншыя далікатэсы. Ды і штодня ў сярэдняй вясковай сям'і руплівых людзей бываюць і катлеты, і адбіўныя. Так што забарона змяніла прывычны для многіх уклад, вядома, не ў лепшы бок.

Праўда, на пачатку вясны прыспела доўгачаканая адмена забароны на ўтрыманне свіней у раёнах так званай буфернай зоны. Як расказалі знаёмыя кіраўнікі сельсаветаў, на адмену хутка адрэагавалі прадпрымальнікі. Ездзяць па вёсках, прапануюць маладняк свіней па цане 2 мільёны рублёў за пару. І гэта нармальна. Бо цана на свінакомплексах на малых парасят не намнога меншая, тым больш што далёка не ўсе маюць маладняк на продаж. А тут табе — дастаўка да хлява без лішніх турбот. Здавалася б, усё пакрысе вяртаецца да ранейшага. І хутка ў хлявах зноў зарохкае жыўнасць, а на базар павязуць лішкі свініны.

Зона непаразумення

Але застаецца пяцікіламетровая зона, якая часта становіцца зонай сутыкнення інтарэсаў, непаразумення і абурэння. Так, некаторыя вялікія населеныя пункты (напрыклад, такія, як вёска Цна ў Лунінецкім раёне) працягнуліся на некалькі кіламетраў. У так званую 5-кіламетровую зону трапляе толькі частка вёскі, а вось другі яе канец аддалены ад комплексу на 7-8 кіламетраў. Усё роўна, паводле правілаў, трымаць свіней у такім населеным пункце нельга. Ды і не толькі гэтыя нюансы хвалююць сельскіх жыхароў. Калі адмянілі забароны на буферныя раёны ў цэлым, людзі чакалі, што вось-вось адменяць і ўсе абмежаванні — аж да «савецкіх» 500 метраў. Гэтага



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

не адбылося.

Хутчэй за ўсё, пяцікіламетровая зона забароны застанецца назаўсёды. І каб прывыкнуць да новых умоў, патрэбны пэўны час. У шэрагу населеных пунктаў прайшлі на гэтую тэму сельскія сходы. Размова адбывалася, мякка кажучы, эмацыянальная.

Адзін з такіх сходаў прайшоў у вёсцы Хідры Кобрынскага раёна. У пяцікіламетровую зону мясцовага свінагадоўчага комплексу на 24 тысячы галоў увайшло 17 вёсак. Забой сваёй жыўнасці вяскоўцам давялося правесці сярод лета. Тады ўсіх, хто закалоў свіней, унеслі ў асобны спіс у сельскім Савеце. Гэтыя людзі атрымалі ўмоўны статус пацярпелых. Ім абяцалі прадаваць мяса са свінакомплексу па сабекошце.

Вось гэтае пытанне і паўстала на сходзе. Аказалася, што свініну сапраўды прадавалі па сельсавецкіх спісах. Але пацярпелымі сябе лічаць і іншыя вяскоўцы. Скажам, гаспадар забіў свайго кабанчыка за тыдзень да аб'яўлення забароны. Ён жа спадзяваўся купіць малых свіней і зноў іх выкарміць. А ў спісы яго тады не ўнеслі. Такіх пакрыўджаных набралася многа. І іх прэтэнзіі зразумелыя. Але і не гэта галоўнае. Людзі ўсё ж спадзяваліся, што і ім рана ці позна дазволяць аднавіць падсобную гаспадарку. Адна жанчына задала прысутным кіраўнікам раёна пытанне: «Што ж рабіць?» — і не атрымала адказу, які б яе задаволіў. Перад гэтым яна патлумачыла, што зарплату мае каля 2 мільёнаў у месяц. У яе двое дзяцей-школьнікаў, якіх яна паўнацэнна карміла менавіта мясам са сваёй падсобнай гаспадаркі. Цяпер такой магчымасці няма. Пераключыцца адразу на гадоўлю бройлераў або цялят атрымліваецца не ва ўсіх. Як не ва ўсіх ёсць магчымасць паставіць свайго кабанчыка ці свінню ў хлеў да сваякоў з суседняй вёскі. Аб гэтым таксама гаварылі на сходзе. Каму пашанцавала, хто ў суседняй вёсцы мае сваякоў або добрых знаёмых, — той завёз ім парасят і кармы. Але ж далёка не кожны згадзіўся б даглядаць чужую жыўнасць. Таму гэта, хутчэй, адзінкавыя выпадкі, а не вырашэнне праблемы.

“Хутчэй за ўсё, пяцікіламетровая зона забароны застанецца назаўсёды. І каб прывыкнуць да новых умоў, патрэбны пэўны час.

У Малечы Бярозаўскага раёна на сельскім сходзе наогул прапанавалі ліквідаваць комплекс камбікормавага завода, на якім утрымліваецца 2 тысячы галоў свіней, а дазволіць трымаць жывёлу людзям. Але на такія меры, відавочна, ніхто не пойдзе. Наадварот, стаіць задача ўсімі спосабамі нарошчваць пагалоўе ў сельгаспрадпрыемствах.

Дырэктар названага камбікормавага завода Міхаіл КАЗЕКА сказаў, што ўся праблема ў розніцы паміж санітарнымі нормамі. Большасць свінагадоўчых комплексаў узводзілася ў савецкія часы. Тады межы забароны вызначаліся адлегласцю ў 500 метраў. Цяпер радыус забароны павялічыўся — у адпаведнасці з еўрапейскімі і сусветнымі стандартамі — да пяці кіламетраў. Вось і ўзніклі праблемы, і праблемы немалыя, бо звязаны яны з дабрабытам многіх вясковых сем'яў.

❍❍❍

Свініны ў крамах і на рынках Брэста дастаткова. Праблема не ў яе наяўнасці, а ў цане. А вось спрагназаваць падзенне росту цаны пасля таго, як удасца аднавіць колькасць пагалоўя сельгаспрадпрыемстваў і павялічыць яго на прыватных падворках, ніхто пакуль не бярэцца. Цэны рухаюцца наперад, і «заганяць» іх будзе цяжка...

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НА ШЫІ Ў БАЦЬКОЎ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Дык той дапамогі, што выдзеліць дзяржава, табе хопіць — прыязджай, — імкнулася ўгаварыць Любоў Забаронак.

Але ні ўшчуванні, ні просьбы не падзейнічалі на маладзіцу. І тады Любоў Уладзіміраўна высветліла, дзе працуе жанчына, і звязалася з яе кіраўніцтвам. Але нават яны не змаглі прымусіць яе змяніць рашэнне, хоць абяцалі матэрыяльную дапамогу на пахаванне...

Арганізоўвалі пахаванне чужыя людзі: сацыяльныя работнікі і старшыня сельскага Савета. Аказалася, у яе нават не было прыстойнага адзення. Давялося нават адзенне купляць. У апошні шлях Кацярыну Сцяпанаўну праводзілі старыя бабулькі: сельскі Савет знайшоў транспарт, каб прывезці іх на могілкі... На наступны дзень тэлефануе роднае «дзіцятка»: «Ну як там маму пахавалі, хоць па-людску? А ці засталіся грошы ад памінак? Спадзяюся, не ўсе патрацілі? Дык я прыеду забяру, а заадно і пенсію апошнюю атрымаю...»

“На наступны дзень тэлефануе роднае «дзіцятка»: «Ну як там маму пахавалі, хоць па-людску? А ці засталіся грошы ад памінак? Спадзяюся, не ўсе патраціліся? Дык я прыеду забяру, а заадно і пенсію апошнюю атрымаю...»

У Любові Забаронак нават дыханне перахапіла ад такога нахабства...

— Пасля бабулі яшчэ і спадчына засталася: якая-ніякая хаціна з ўчасткам. Думаю, дачка будзе звяртацца да мяне, каб аформіць дакументы. Не ведаю, як паглядзіць у вочы...

Па вясковай вуліцы борздзенька шыбуе мужчына гадоў 60 з сумкай, адкуль тырчыць бутэлька «беленькай». «Сынок прыехаў з горада 90-гадовую маці «праведаць», — тлумачыць Любоў Уладзіміраўна.

— Калі ж вы падворак абкосіце? — цікавіцца яна ў мужчыны.

— А вы, сельсавет, навошта? Мая маці здароўе на вас паклала (працавала на ферме), а вы яшчэ прымушаеце мяне, хворага, траву касіць?

— Ну і як разбудзіць сумленне ў такіх, як ён? — уздыхае Любоў Уладзіміраўна. — Як растлумачыць, што сельскі Савет не абавязаны абкошваць прыватныя падворкі? Немагчыма гэта нават фізічна: ёсць вёскі, дзе жывуць дзясяткі састарэлых. Але, калі звяртаюцца адзінокія старыя, ідзем ім насустрач.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жывуць у нас і пенсіянеры, што пакінулі гарадскія кватэры дзецям, а самі перасяліліся ў сельскую мясцовасць. Мінулай зімой занесла дарогу да трох такіх дамоў. Расчысцілі, а потым пачалося пацяпленне і снег літаральна ўтрамбаваўся. І трэба ж такому здарыцца, што ў адных старых памёр у Мінску сын. Другі сын прыехаў забраць бацькоў на пахаванне. А праз дзень прывёз іх назад — ды не змог пад'ехаць на аўто да самай хаты... Праз колькі часу тэлефануе мне з пагрозамі: маўляў, чаму не выконваеце сваіх непасрэдных абавязкаў?.. А я яму ў адказ: «Гэта вы не выконваеце сваіх абавязкаў, бо добрыя дзеці зімой забіраюць старых у горад, дзе не трэба печку паліць ды па ваду хадзіць да студні...»

...Калісьці мы ўсе станем старымі. І дзе гарантыя, што нашы дзеці не паступяць гэтак жа з намі? Яны — наша люстэрка, капіруюць усе ўчынкі дарослых. Людзі майго пакалення помняць, з якім клопатам ставіліся да старых нашы бацькі. Мой тата заўсёды казаў нам дзецям: «Падсадзіце дзеда на печ — вас унукі таксама падсадзяць».

— Так, мы імкнёмся дайсці да кожнага старога, нямоглага чалавека. І школа бярэ над такімі шэфства, і сельскі Савет дапамагае, і гаспадаркі, дзе яны раней працавалі. Але ніякая падтрымка, дапамога збоку не заменяць аднаго ласкавага слова роднага дзіцяці, — лічыць Любоў Забаронак.

Бярэзінскі раён.

НАВІНЫ З РЭГІЁНА

Прэмія — на гарадскую гаспадарку

Хойнікі па выніках рэспубліканскага агляду санітарнага стану і добраўпарадкавання населеных пунктаў за 2013 год сталі пераможцамі ў катэгорыі гарадоў, дзе жыве ад 10 да 50 тысяч жыхароў. За перамогу горад атрымаў прэмію ў памеры 2000 базавых велічынь — гэта 300 млн руб. 70% гэтых сродкаў накіраваны на развіццё гарадской гаспадаркі.

10 кіламетраў новых труб

У аграгарадку **Чырвоны Бераг** Жлобінскага раёна адноўлена работа па мадэрнізацыі мясцовай цеплатрасы. Ідзе замена састарэлых труб на больш надзейныя, якія лепш захоўваюць цяпло. Іх можна будзе эксплуатаваць да 50 гадоў. Пракладка новай цеплатрасы была пачата летась і завершыцца ў гэтым годзе. Яе працягласць — каля 10 кіламетраў.

Прадпрымальнік абжыве дэпо

Будынак пажарнага дэпо ў аграмястэчку **Ціхінічы** Рагачоўскага раёна службамі МНС даўно не эксплуатаваўся. Таму Гомельскім аблвыканкамам было прынята рашэнне прадаць гэту рэспубліканскую ўласнасць. Было праведзена пяць аўкцыёнаў, перш чым пажарнае дэпо знайшло свайго новага ўладальніка. Адзіны ўдзельнік гандлю набыў нерухомасць плошчай каля 250 кв. м за 157 тысяч рублёў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

Вайскоўцы ўзвялі мост

Пантонны двухпалосны мост цераз Іпуць з асобнай пешаходнай дарожкай уведзены ў эксплуатацыю ў **Добрушы**. Яго ўвод дазволіць прыступіць да капітальнага рамонту трох іншых мастоў у райцэнтры. Лепшым вайскоўцам 30-й асобнай Чырванасцяжнай чыгуначнай брыгады за паспяховае выкананне задання па ўзвядзенні моста абвешчаны падзякі і ўручаны граматы.

Дзіцячае аддзяленне адноўлена

У **Петрыкаўскай** райбальніцы пасля рамонту адкрылася дзіцячае аддзяленне. Цяпер тут усё будзе спрыяць выздараўленню: у палатах і кабінетах светла і па-хатняму ўтульна, установлена новая мэбля. На ўрачыстым адкрыцці кіраўніцтва раёна ўручыла ўстанове каляровы тэлевізар.

Каб вярнуцца ў сям'ю

Лоеўскаму сацыяльна-педагагічнаму цэнтру споўнілася 10 гадоў. 518 дзяцей на працягу гэтага часу адчувалі ва ўстанове клопат, якога так не хапала ў сем'ях. Спецыялісты цэнтра займаліся аднаўленнем і карэкцыяй дзіцяча-бацькоўскіх адносін, што дапамагло многім вярнуцца ў біялагічныя сем'і.

З відам на возера

У вёсцы **Кляновіца** Буда-Кашалёўскага раёна фермер Фёдар Кісялеўскі адкрыў новую аграсядзібу. У двухпавярховым доме, пабудаваным з дрэва, восем спальных месцаў, кухня, гасціная з маляўнічым краявідам на возера. Аматары могуць пацешыцца лазняй, більярдам, рыбалкай, засмажыць мяса, пакатацца на катамаранах, пагуляць па лесе. У будучыні тут плануецца адкрыць і гасцініцу.

Гуляем у футбол!

У **Ельску** адкрыта сучасная спартыўная пляцоўка для гульні ў міні-футбол — дзякуючы сацыяльнай ініцыятыве асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола», сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «НТС», праваўладальніка гандлёвага знака «Родны бок — дзецям» і кіраўніцтва Ельскага райвыканкама. Новая пляцоўка ўяўляе сабой поле памерам 20 на 40 метраў са штучным пакрыццём і агароджай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«Чытаючы» тралейбус

На тралейбусе ў падарожжа па родным горадзе адправіліся гродзенскія школьнікі дзякуючы тралейбуснаму ўпраўленню і бібліятэкарам.

Некалькі дзён такім чынам падарожнічалі, пашыраючы свой кругагляд, каля 150 вучняў 2—4 класаў. Яны пазнаёміліся з краязнаўчымі, гістарычнымі кнігамі, паэтычнымі творамі пра горад, прысвечанымі яму фотаальбомамі, здзейснілі невялікія экскурсіі па плошчы Савецкай і парку імя Жана-Эмануэля Жылібера. А на памяць аб падарожжы атрымалі сцяжкі з гербам горада і паштоўкі. Дарэчы, гэтай акцыі папярэднічаў конкурс «Намалюю горад Гродна», прычым лепшыя работы былі выстаўлены ў вокны тралейбуса — атрымалася перасовачная выстаўка.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УСЕ СРОДКІ ДОБРЫЯ

І СВЯТАР МОЖА БЫЦЬ... «НАРКОЛАГАМ»

На Віцебшчыне адпрацоўваюць нестандартныя падыходы ў вырашэнні вострага пытання — прафілактыкі п'янства.

Зразумела, што злоўжыванне спіртнымі напоямі ўплывае на колькасць выпадкаў гібелі грамадзян, у тым ліку ў выніку самагубства.

У пракуратуры Віцебскай вобласці канстатуюць, што ў большасці выпадкаў грамадзяне здзяйснялі самагубства ў выніку злоўжывання спіртнымі напоямі. У Паставах мясцовы жыхар ва ўзросце «за 40» перад смерцю напісаў запіску, у якой развітваўся з былой жонкай і выказваў шкадаванне аб шалапутным сваім жыцці. Ён пакутаваў на хранічны алкагалізм, неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці, быў на ўліку ў нарколага, доўгі час не меў працы. Жудаснае супадзенне: каля года таму яго дачка таксама добраахвотна пайшла з жыцця...

— Летась прыкладна 9% ад усіх памерлых грамадзян развіталіся з жыццём з так званых знешніх прычын гвалтоўнага характару, — паведамілі ва ўпраўленні статыстыкі Віцебскага аблвыканкама.

— Атручванне алкаголем і захворванні ў выніку злоўжывання «зялёным змеем» — у ліку галоўных прычын смярцей, — дадаў, намеснік пракурора Віцебскай вобласці Уладзімір Гук.

Праваахоўнікі не ўтойваюць, што на працягу апошніх дзесяцігоддзяў алкагалізацыя насельніцтва прагрэсуе. І без ўкаранення ў прафілактычную працу новых формаў і метадаў, з аднымі толькі рэпрэсіўнымі мерамі дасягнуць значных станоўчых змен усё цяжэй.

— На рэспубліканскім і абласным узроўнях прыняты шматлікія праграмы, якія прадугледжваюць значную колькасць мерапрыемстваў, накіраваных на прафілактыку п'янства і алкагалізму. Але іх рэалізацыя дагэтуль не дасягнула запланаваных вынікаў. Неабходна заахвоціць людзей перастаць быць абыякавымі. Ні для суседзяў, ні для сваякоў або калег алкаголіка лад яго жыцця не сакрэт. Аднак пітушчыя не атрымлівалі адкрытага асуджэння. Нам прасцей быць абыякавым, дазваляць п'янстваваць і брыдкасловіць, чым праславіцца «даносчыкам», — працягвае Уладзімір Гук.

— Паняцце «цвярозасць» можна растлумачыць як патрэбу ў сумленным, чыстым поглядзе на самога сябе і на навакольны свет. Цвярозасць — гэта свабода ад самападману... Яна патрабуе мужнасці, адзіная магчымасць вырвацца з заганнага круга любой залежнасці — толькі шчырае пакаянне, — лічыць архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітрый. — У апошні час наш народ схіляецца да культу спажывальніцтва, нажывы. Гэтыя тэндэнцыі руйнуюць духоўна-маральныя асновы грамадства — той падмурак, без якога немагчыма здаровая будучыня нацыі.

На думку святароў і праваахоўнікаў, пакольк п'янства, наркаманія, гвалт, амаральнасць — ворагі як дзяржавы, так і царквы, скаардынаваная сумесная праца можа даць пэўны вынік. Таму пракуроры ў рэгіёнах сустракаюцца з прадстаўнікамі традыцыйных рэлігійных канфесій — для выпрацоўкі сумесных мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне здаровага, духоўна-маральнага ладу жыцця, замацавання ў насельніцтва ўстаноўкі на цвярозасць.

Дарэчы, не сакрэт, што рэгулярны ўдзел у пасяджэннях саветаў прафілактыкі прадстаўнікоў адных і тых жа ведамстваў і грамадскіх фарміраванняў прыводзіць да фармалізму. Уключэнне ж у склад гэтых грамадскіх фарміраванняў святароў дапаможа эфектыўна каардынаваць сумесную працу. Пры храмах ужо праводзяцца кансультаванне тых, хто пакутуе ад залежнасцяў, і іх сваякоў, арганізуюцца таварыствы цвярозасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.608. Нумар падпісаны ў 19.30 3 чэрвеня 2014 года.